# *МЕТАФАРЫЧНА, ПА-ФІЛАСОФСКУ*



**16 мая 2024 года створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Гродзенская грамадская літаратурная школа правяла апошнія перад летнімі канікуламі заняткі. Тэма сустрэчы: «Кампазіцыя твора. Кульмінацыя».**

Разгляд кульмінацыі сюжэту як мастацкай з'явы атрымаўся нешматлюдным. Але атмасферы мерапрыемства гэта не пашкодзіла. Акрамя двух членаў СПБ, удзельнікамі заняткаў сталі нашы сябры і калегі – пісьменнікі і аматары літаратуры з Гродна, прадстаўнікі розных пакаленняў, літаратары - пачаткоўцы і аўтары ўласных кніг.

У тэарэтычным блоку слухачы атрымалі звесткі пра тое, што такое кульмінацыя і кульмінацыйны момант у літаратурным творы, што пасля кульмінацыі адбываецца з героямі твора, як на творы можа адбіцца адсутнасць кульмінацыі, якія бываюць віды кульмінацыі. Каб палегчыць працэс практычнага прымянення ведаў, слухачам было прапанавана другую частку сустрэчы правесці ў форме дыскусійнага блока. Творчыя людзі як правіла добра валодаюць пераносным сэнсам слоў і паняццяў. Таму значэнне паняцця «кульмінацыя» перанеслі на ўсю творчасць кожнага з прысутных і паразважалі пра тое, якім нам бачыцца гэты важны, пераломны, пікавы момант.

Кульмінацыя – самая цікавая частка твора. Таму калі ў якасці практычнага прыкладу метафарычна разглядаць не кампазіцыю аднаго твора, а ўвесь творчы шлях асобна ўзятага аўтара, размова магла б атрымацца цікавай і прынесці карысць. На шчасце, яна і атрымалася такой. У ходзе гутаркі былі закрануты надзвычай важныя аспекты філасофіі чалавечага быцця ў свеце людзей і ў свеце мастацтва, каштоўнасныя арыенціры, неадназначныя моманты гісторыі мастацтва і нашай агульнай гісторыі. Слухачы шчыра падзяліліся сваім бачаннем кульмінацыі творчага пошуку (дзякуй усім). Размову на гэтую тэму можна лічыць адным з найбольш удалых момантаў у гісторыі нашай літшколы. А ці стане гэты момант пераломным, – не будзем загадваць, гэта пакажа жыццё. Галоўнае, – што нам, такім розным, удалося і ўдаецца сумеснымі намаганнямі захоўваць узаемныя паразуменне і павагу. Як мінімум гэта азначае, што і вывучэнне развязкі ў верасні нікога не расчаруе.

Нагадваем, што створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Гродзенская грамадская літаратурная школа мае не толькі фармат калектыўнага грамадска-адукацыйнага праекта. У офісе СПБ-Гродна па папярэдняй дамоўленасці абсалютна бясплатна можна атрымаць літаратурную кансультацыю і неабходны інструментар для вырашэння самых разнастайных праблем літаратурнага працэсу. Калі ласка, звяртайцеся па дапамогу!

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота**: створаная Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі грамадская літаратурная школа правяла апошнія перад летнімі канікуламі заняткі. Тэма сустрэчы – «Кампазіцыя твора. Кульмінацыя». Офіс СПБ-Гродна. 16 мая 2024 года.










МАЙ
2024
MAY


МАЙ
2024
MAY




















ДИПЛОМ
ДЫПЛОМ
ГРАМАТА
ГРАМАТА
ПАДЗЯКА
ПАДЗЯКА






**Фота** Анатоля Апанасевіча